2) Чым занятыя мужчына і жанчына?

3) Чаму мастак увяла ў твор жывапісу вобраз бусла, які знаходзіцца на капусце? Паразважайце.

4) Пра што, на вашу думку, сведчаць сонца і месяц, дом, партрэт маладых, разнастайныя прыгожыя кветкі і зялёны круглы кусцік папараці на галінах дрэва?

5) Якія агульначалавечыя абавязкі і законы жыцця адлюстраваны на карціне Ганны Сілівончык?

***Зы́бкі*** — які знаходзіцца ў стане лёгкага руху, хістання.
***Зы́ркі*** — яркі, асляпляльны.

## КАЛІ РАНА ЎСТАНЕШ

*Ніл Гілевіч*

Калі рана ўстанеш —
Разам з сонцам зыркім,
Што ўсплыве над зыбкім
Вогнішчам зары, —
Колькі ты пабачыш
З'яў жыцця дзівосных,
Колькі цудаў розных
Згледзіш на двары!

Калі рана ўстанеш —
Разам з ветрам буйным,
Што абудзіць струны
Неба, дрэў, травы, —


Правообладатель Национальный институт образования

Колькі ты пачуеш
Гукаў-зыкаў дзіўных,
Звонаў пераліўных,
Спеваў харавых!

Калі рана ўстанеш —
Разам з першай птушкай,
Што шукае тут жа
Для дзяцей яды, —
Колькі ты паспееш
Памагчы слабейшым,
Падтрымаць, суцешыць,
Выручыць з бяды!

Калі рана ўстанеш —
Разам з мамай, татам
Ды за справу-працу
Возьмешся хутчэй, —
Колькі ты пазнаеш
Радасці нясцерпнай —
Аж да песні з сэрца,
Аж да слёз з вачэй!

Калі рана ўстанеш —
Разам з сонцам яркім,
Разам з ветрам шпаркім,
Разам з белым днём, —
Сам тады, мой дружа,
Разумець ты будзеш,
Для чаго мы, людзі,
На зямлі жывём.


Правообладатель Национальный институт образования

1. Да каго Ніл Гілевіч звяртаецца ў вершы?
2. Да чаго заклікае паэт чытача? Прачытайце адпаведныя радкі.
3. Што з пералічанага, на думку аўтара, будзе радаваць чалавека?
4. Як вы разумееце сэнс выразу «вецер абудзіць струны неба, дрэў, травы»?
5. У чым заключаецца асноўная думка гэтага верша? Выберыце адзін адказ з ліку прапанаваных:
   а) аўтар заклікае чытача любавацца цудамі навакольнага свету;
   б) заклікае слухаць разнастайныя гукі прыроды;
   в) заклікае дапамагаць слабейшым;
   г) заклікае быць актыўным і дзейным чалавекам у паўсядзённым жыцці.
6. Ці згодны вы з думкай паэта? Чаму?

Верш Ніла Гілевіча «Калі рана ўстанеш» пакладзены на музыку Валерыяй Яскевіч. Паслухайце песню ў яе выкананні. Выкажыце свае пачуцці і думкі, што ўзніклі падчас знаёмства з гэтым музычным творам.

## ПРЫКАЗКІ

- Жыццё пражыць — не поле перайсці.
- Кожны чалавек — свайго шчасця каваль.
- Хто толькі сам сябе любіць, таго ніхто не любіць.
- Не зведаўшы броду, не сунься ў ваду.
- Любіш катацца — любі і саначкі вазіць.
- Чужым розумам не пражывеш.


Правообладатель Национальный институт образования